Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 СНЕЖНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 242 (28352)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Беларусы ў люстэрку даследаванняў**

СТАР. 4



**Быць музею Адамовіча**

СТАР. 15

Сямейная газета



**Няхай дзіця малюе. На… шпалерах**

■ Добрая навіна

# НУМАР ПЕРШЫ

## У Магілёве ўрачыста здалі першы ў краіне энергаэфектыўны дом

**Ён першы нават па нумары і размешчаны на вуліцы імя Аркадзя Куляшова. Яшчэ два такія будынкі ўзводзяцца ў Мінску і Гродне. Але магілёўскія будаўнікі справіліся першымі. Дом стане родным для 160 шматдзетных сем'яў. Паветраныя шары, музыка, шчаслівыя ўсмешкі навасёлаў — падзея стала сапраўдным святам.**

СТАР. 3



Фота БЕЛТА.

Сімвалічны ключ у руках навасёлаў – Паўла СВІШЧАНКОВА і яго сыноў Антона і Максіма.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Не менш як $1,4 млрд**

*прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове плануе прыцягнуць Беларусь у 2017 годзе. Валавы ўнутраны прадукт плануецца нарасціць на 1,7 працэнта да ўзроўню 2016 года ў супастаўных цэнах. Мяркуецца, што прадукцыйнасць працы павялічыцца на 1,8 працэнта, экспарт тавараў і паслуг — на 3,8 працэнта, рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва — на 1,3 працэнта. Сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі складзе 0,1 працэнта. Індэкс спажывецкіх цэн не перавысіць 9 працэнтаў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9548 | ▲ |
| Еўра | 2,0817 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0321 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0742 | ▼ |

■ Рынак працы

# МІНЧАНЕ ШУКАЮЦЬ РАБОТУ ДАЎЖЭЙ ЗА ЎСІХ,

## а ў асобных рэгіёнах вакансій больш, чым саіскальнікаў

**Ужо восьмы месяц запар колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных зніжаецца. Калі ў маі ў гэтым статусе былі амаль 54 тысячы чалавек, то ў снежні — каля 36 тысяч. Цяпер узровень беспрацоўя складае 0,8 працэнта ад усяго эканамічна актыўнага насельніцтва.**

Напружанасць на рынку таксама змяншаецца. На адну вакансію прыпадае адзін беспрацоўны (летась у снежні на свабоднае месца было 1,5 саіскальніка). А ў Мінску, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцях вакансій больш, чым прэтэндэнтаў.

У сярэднім на пошук работы беларусам патрэбна 2,3 месяца. Што цікава: хутчэй за ўсіх удаецца ўладкавацца жыхарам Магілёўскай вобласці — за 1,9 месяца. А вось у мінчан на выбар патрэбнай працы ідзе 3,5 месяца.

Што да свабодных месцаў, то ў Агульнарэспубліканскім банку вакансій іх налічваецца амаль 39 тысяч (на 21 працэнт больш, чым было год таму). Больш за палову з іх (52 працэнты) — па рабочых прафесіях. Самай запатрабаванай вакансіяй у наймальнікаў застаецца медыцынская сястра — 2200 свабодных месцаў. Традыцыйна патрэбны ўрачы-спецыялісты: у краіне не хапае 1875 медыкаў. Заробкі прапануюць розныя: 800 рублёў і больш гатовы плаціць на 55 вакансіях (амаль усе ў сталіцы) — напрыклад, неўролагу ў 11-й гарадской дзіцячай паліклініцы Мінска ці псіхатэрапеўту Столінскай цэнтральнай раённай бальніцы. Разам з тым 46 працэнтаў свабодных месцаў для ўрачоў — з заробкам да 400 рублёў (але трэба адзначыць, што многія з іх — гэта работа на чвэрць ці палову стаўкі).

СТАР. 3

■ Фінансы

# У ФАЗЕ ЎПЭЎНЕНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

## Сёння менавіта так ацэньваюць «здароўе» беларускай валюты нават незалежныя аналітыкі

**Напрыклад, сур'ёзны эксперт на фінансавым рынку кампанія ТэлеТрэйд вырашыла прааналізаваць дынаміку банкаўскіх укладаў. Аказалася, што яны сёлета пачалі... скарачацца. Гэта і не дзіўна, бо рэальныя даходы большасці беларусаў ужо не павялічваюцца. Эксперт-аналітык кампаніі ў нашай краіне Жанна Кулакова адзначае, што цяпер раней зробленыя зберажэнні выдаткоўваюцца на спажыванне. Атрымліваецца, што няпростае фінансавае становішча прымушае людзей жыць па сродках. Гэта калі бягучых даходаў хапае на ўжо звыклы ўзровень жыцця. А калі не? У такім выпадку людзі пачынаюць скарачаць выдаткі або «праядаць» зробленыя раней назапашванні. Цікава, а як гэта можа паўплываць на фінансавае становішча нашага рубля? Паспрабуем разабрацца з калькулятарам у руках.**

### Не паклаўшы, не возьмеш

Намінальна рублёвыя дэпазіты за 10 месяцаў выраслі на 7,8% з 2,61 да 2,82 млрд рублёў. Аднак прырост з пачатку года не перавышае капіталізаваныя працэнты, а апошняе сведчыць аб тым, што новых грошай банкі па сутнасці не атрымалі. Па валютных укладах адток яшчэ больш відавочны. За 10 месяцаў аб'ём тэрміновых валютных укладаў фізічных асоб скараціўся з 7,69 да 7,07 млрд рублёў. У выніку з пачатку года нашы людзі забралі з банкаў кожны 12 -ы долар. У працэнтах скарачэнне склала амаль 8%.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!